Дзідро, які нічога не можа, не здатны ні на што. Гогалеўскі Акакій Акакіевіч і персанажы тургенеўскіх "Нататкаў паляўнічага" - гэта яшчэ толькі набліжэнне да "новага героя" заходнееўрапейскай асветніцкай літаратуры. Байкі Крылова і "Гора ад розуму" Грыбаедава відавочна выйшлі з класіцызму, які ў "нізкім жанры" мае значныя дасягненні ў рэалістычным адлюстраванні рэчаіснасці,набліжэнні да жыцця. І ці не маюць нічога агульнага пошукі ідэальнага ў Дастаеўскага і рамантыкаў?..

Думаецца, менавіта вось такое ўзаемадзеянне розных мастацкіх накірункаў, сумяшчэнне паслядоўных, вынікаючых і змяняючых адзін аднаго перыядаў развіцця сусветнай літаратуры ў адным часе на глебе рускай рэчаіснасці і парадзілі той выдатны эстэтычны феномен, якім з'яўляецца руская літаратура XIX ст.

Шмат новага і цікавага можна ўбачыць і ў гісторыі беларускай літаратуры, калі адысці ад фармалісцкага "далучэння" яе да сусветнай. Накідваючы на гісторыю нацыянальнай літаратуры як вопратку назвы этапаў, перыядаў развіцця сусветнай літаратуры, прытрымліваючыся заходнееўрапейскай храналогіі мастацкага працэсу, мы глыбока, да канца не раскрыем яе істотных асаблівасцей. Да таго ж не трэба забываць, што і ў развітых літаратурах краін Захаду таксама назіраюцца разыходжанні ў часе выспявання і праходжання гэтых этапаў, толькі ў параўнанні з усходнеславянскімі літаратурамі - не такія значныя.

Пры вывучэнні нацыянальнага літаратурнага працэсу нельга абапірацца на адны часавыя адзнакі агульных для сусветнай літаратуры этапаў і перыядаў. Кожная асобная літаратура з'яўляецца неаддзельнай часткай сусветнай літаратуры, развіваецца па адзіных законах мастацтва. Пры даследаванні любой літаратурнай з'явы на яе неабходна глядзець з пункту гледжання гэтых законаў: якія агульныя тэндэнцыі, заканамернасці развіцця ўвасоблены і як выяўляюцца ў аб'екце вывучэння. Галоўнае тут - у вызначэнні ўзроўню спасціжэння чалавечае асобы ў яе развіцці разам з грамадствам, бо гісторыя літаратуры ў цэлым - гэта гісторыя асобы, яе станаўлення,развіцця, ускладнення, адбітая не толькі непасрэдна ў самім паказе чалавека, але і ў развіцці і адпаведным ускладненні форм і сродкаў выяўленчага мастацтва, майстэрства раскрыцця прыроды чалавека. Як вядома, метад пазнання, у тым ліку і мастацкага, абумоўлены ў немалой ступені самім прадметам пазнання. Акрамя таго, гэта адначасова і гісторыя грамадскай самасвядомасці, важнай часткай якой з'яўляецца мастацтва.

Зыходзячы з вышэй сказанага, на наш погляд, многія моманты гісторыі беларускай літаратуры патрабуюць удакладненняў і некалькі іншага асвятлення, чым маюць цяпер. Возьмем, напрыклад, сярэднявечны перыяд. Адзінае, што засталося ад літаратуры антычнага свету, была царкоўная. "Свецкая" літаратура пачынала з пачатку: з вуснай народнай творчасці. Гэта першы этап яе развіцця. Пасля нараджаюцца рыцарская і гарадская. Гэта асноўныя этапы развіцця і разам з тым напрамкі сярэднявечнай літаратуры, якія ўзаемаўплываюць адзін на аднаго.

Не лічачы "Слова аб палку Ігаравым" (гераічны народны эпас), казак, паданняў, песень, а таксама перакладзеных рыцарскіх раманаў, беларускую літаратуру складаюць творы царкоўнай плыні і летапісы. Тут трэба прыгадаць пачатак развіцця антычнай мастацкай прозы. Яна ўзрасла на гісторыі, філасофіі, красамоўстве. Летапісы - гэта гістарычныя творы. Творчасць, скажам, Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага - і царкоўная літаратура і, безумоўна, філасофія і часткова - красамоўства. І вось тут неабходна абавязкова ўдакладняць мастацкія вартасці гэтых твораў, выразна акрэсліваць іх значнасць
для развіцця менавіта мастацка-літаратурных, апавядальных традыцый.

Падобнага роду ўдакладненняў патрабуюць і астатнія перыяды гісторыі беларускай літаратуры.

Няфёдаў В.В.,
докт.філал.навук,
прафесар

## ПРАБЛЕМА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СЛАВІСТЫКІ Ў СУСВЕТНЫМ КАНТЭКСЦЕ ЯК АДЗІН З ПРЫЯРЫТЭТАЎ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ КУЛЬТУРЫ

Гаворка пойдзе аб комплексе ідэй, якімі неабходна валодаць беларускім кадрам культуры.

Славянская пісьменнасць св.Кірылы і Мяфодзія забяспечыла тысячагадовую традыцыю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнага абмену паміж народамі. Гэта выключная ўнікальная частка сусветнай гісторыі. На гэтай аснове вырасла праваслаўная руская (вялікаруска-беларуска-украінская), русацэнтрысцкая многанацыянальная цывілізацыя, якая называецца Расія. Складаныя славянскія сувязі ўтварыліся гістарычна. Сучаснасць ставіць праблему захавання спадчыны і цывілізацыйных арыенціраў.

Мы прытрымліваемся канцэпцыі адзінства культуры. Прынцыповая сканцэнтраванасць на беларускім матэрыяле абазначае захаванне сапраўды нацыянальнага, накіраванага не на ізаляцыю, якая б абазначала фатальнае выраджэнне, а на жыватворныя вечныя каштоўнасці.

Мы будзем умацоўваць традыцыйныя сувязі з вялікарускай культурай, ідучы ў гэтым за беларускім народным інстынктам. Культура Рублёва і Дыянісія, Ламаносава і Дзяржавіна, Пушкіна і Гогаля, Талстога і Дастаеўскага, Чайкоўскага і Чэхава, Блока і Буніна, Ахматавай і Шолахава, Арцёмава і Салжаніцына выратавальна для тых, хто асмельваецца процістаяць распаду культуры, крушэнню маральнасці, ачарсцвенню чалавечых душ, разгулу нізкіх пачуццяў.

Руская літаратура арганічна ўкаранёна ў беларускім свеце. Руская літаратура XX ст. з'явілася пажыўным асяроддзем для славянскіх і заходніх літаратур. Сваімі пошукамі яна ўплывала на склад сучасных рэалістычнай, рамантыка-мадэрнісцкай і авангардысцкай літаратур, што ніякім чынам не зніжае іх нацыянальнай самабытнасці. Рускую мову і літаратуру XX ст. не трэба падаваць з дапамогай урадавых мер як сусветныя з'явы. Рускую літаратуру чытаюць у славянскім, заходнім і ўсходнім свеце таму, што людзі там дараслі да разумення універсальнасці культуры. Чытанне рускіх пісьменнікаў абазначае пашырэнне эмацыянальнай структуры чалавека, страту цікавасці да прыватнага, дробнага, нацыянальна абмежаванага. Гэта аддаленне ад вузкасці, мястэчковасці пачуццяў, якія за межамі сямейнага кола аказваюцца проста нуднымі. Руская паэзія - гэта перш за ўсё паэзія агульначалавечая. Такі ж нацыянальны склад, традыцыі, пафас, сэнс існавання. Медыкаменты, якія выпрацоўваюцца ў яе лабараторыях, прадугледжваюць заўсёды выратаванне ўсіх. Летуценнікі знаходзяць у ёй надзею і апору.

Міжнародная русістыка адыгрывае пазітыўную і незаменную ролю ў наладжванні сапраўды чалавечых сувязей. Гэта багацейшая частка славістыкі, заснаванай выдатным чэхам Й.Даброўскім у XVIII ст. Яго запавет дакладны і выразны: "Славяне - гэта славяне".

Нас, гуманітарыяў, аб'ядноўвае імкненне да ідэалу. Нам трэба набрацца цярпення ў шматслойных акалічнасцях беларускага адраджэння. Хваробы вылечваюцца не палітыкай, а любоўю. Вядома, былая славянская садружнасць да нашага часу змянілася і патрабуе новых ацэнак. Мы павінны працаваць сумленна, каб стварыць моцную нацыянальную культуру. У гэтай справе нам дапамогуць сувязі з Расіяй і новыя сувязі з іншымі краінамі. Гэтыя сувязі нам патрэбныя як разумныя і жыццядзейныя асновы, таму што дапамогуць разабрацца ў нас саміх у супастаўленні з тым ці іншым культурным светам.

Малчанава М.С.,
канд.філал.навук,
ст.выкладчык

## ПРАБЛЕМЫ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК АДЗІН З ПРЫЯРЫТЭТНЫХ НАПРАМКАЎ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ-КУЛЬТУРОЛАГАЎ

Адной са значных тэм сусветнай літаратуры з'яўляецца тэма прызначэння паэта і паэзіі, мастака і мастацтва ў жыцці грамадства і ўсяго чалавецтва на розных этапах яго развіцця. Прыкладаў таму ў літаратуры шмат.

Разгледзім, як асвятляецца гэта тэма ў літаратуры XIX - пач.XX ст. Тэма мастацтва і мастака займае значнае месца ў творчасці такіх паэтаў і пісьменнікаў, як А.Пушкін і Д.Байран, М.Ламаносаў і М.Някрасаў, Э.Т.А.Гофман і А.Бальзак, О.Уайльд і Д.Лондан, Т.Драйзер і А.Франс, М.Багдановіч і А.Міцкевіч і інш.

Возьмем, напрыклад, творчасць мастака-рамантыка Э.Т.А.Гофмана. Цэлы шэраг яго рамантычных апавяданняў прысвечаны музыканту і кампазітару Іагану Крэйслеру, які намагаўся пры дапамозе цудоўнай музыкі, творцам якой ён з'яўляўся, пераўтварыць свет, зрабіць жыццё людзей светлым, радасным і прыгожым, а саміх людзей - добрымі і справядлівымі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ